# МАРАЛЬНА-АСВЕТНІЦКІЯ ПОШУКІ ФІЛАМАТАЎ І ФІЛАРЭТАЎ

*В.С. Болбас., к.п.н. дацэнт, першы прарэктар УА МДПУ*
*І.С. Сычова., аспірантка УА МДПУ*

Артыкул прысвечаны маральна-асветніцкаму аспекту дзейнасці членаў студэнцкіх таварыстваў філаматаў і філарэтаў, якія былі створаны ў пачатку XIX стагоддзя ў Віленскім універсітэце, тагачасным навукова-педагагічным цэнтры беларускіх земель. Пошукі папярэднікаў у многім сугучны сучасным праблемам.



Статья посвящена нравственно-просветительскому аспекту деятельности членов студенческих обществ филаматов и филаретов, действовавших в Виленском университете, центре образования на белорусских землях в начале XIX века. Нравственные и научные поиски молодежи прошлого во многом созвучны современным проблемам и представляют собой одну из рассматриваемых проблем курса истории педагогики.

It is devoted to moral – educational aspect of the activity of members of student's societies of filomatov and filaretov, working in Vilenski university, the centre of education on the Belarus grounds in the beginning of XIX century. Moral and scientific researches of the past are conformable to modern problems in many respects.

Рэнесансам вольнадумства і гуманізму называюць даследчыкі эпоху Асветніцтва на Беларусі, якая набіралася моцы і фарміравалася паміж уплывамі польскай і рускай культур, але захавала сваю адметнасць і непаўторнасць. Найбольш яскрава традыцыі педагагічнай думкі гэтага часу праявіліся ў дзейнасці тайных таварыстваў моладзі, якія існавалі ў Віленскім універсітэце ў 1817–1823 гадах. Дакументы сведчаць, што большасць членаў тайных таварыстваў – ураджэнцы беларускай зямлі [2, 16]. Таму духоўныя, асветніцкія пошукі народнай інтэлігенцыі па праву з'яўляюцца набыткам нацыянальнай культуры і сістэмы выхавання.

У перакладзе з грэчаскай мовы філаматы – тыя, хто імкнецца да ведаў, філарэты – прыхільнікі дабрачыннасці і маральнай чысціні. Каля вытокаў стварэння аб'яднанняў стаялі студэнты Тамаш Зан, Адам Міцкевіч, Юзаф Яжоўскі і іх аднадумцы. Асноўнымі напрамкамі дзейнасці яны абралі самаадукацыю, узаемадапамогу ў навуковых даследаваннях і літаратурнай творчасці. Сваю мэту віленскія студэнты бачылі ў выдатнай вучобе, унутраным задавальненні ад працы, учынкаў, побыту, у прымнажэнні славы продкаў, народнай асвеце, самаўдасканаленні і маральнай чысціні, прычым асабістае шчасце цесна перапляталася і залежала ад грамадскага дабрабыту. Дзейнасць таварыстваў праходзіла ў навуковых пасяджэннях, асабістых стасунках, адзначэнні імянін і іншых урачыстасцей. Вялікая розніца ў характарах, тэмпераментах і схільнасцях не перашкаджала ім “жыць адной сям'ёй, як мага часцей сустракацца, шукаць агульных забавак і памагаць адзін аднаму ў самаадукацыі” [2, 299].

Іх, выхаванцаў розных школ, аб'яднаў Віленскі універсітэт – асяродак навукі і культуры на землях былога Вялікага княства. Так, Ян Чачот і Адам Міцкевіч вучыліся ў дамініканцаў. Антоні Адынец скончыў базыльянскую школу. Ануфры Петрашкевіч і Ігнат Дамейка – выхаванцы Шчучынскай піярскай школы, дзе вялікая ўвага надавалася прыродазнаўчым дысцыплінам, быў створаны мінералагічны музей. Юзаф Кавалеўскі вучыўся ў Свіслацкай гімназіі, Тамаш Зан – у Мінскай, Міхаіл Рукевіч – у Беластоцкай. Аляксандр Ходзька атрымаў хатняе выхаванне.

Будучы паэт і філолаг, знаўца ўсходніх моў Фелікс Кулакоўскі - родам з Мазыра, дзе, магчыма, вучыўся ў мясцовай мужчынскай гімназіі. Такім чынам, будучыя філаматы і філарэты былі выхаваны ў лепшых традыцыях айчыннай школы, а таксама згодна шляхецкіх і народных звычаяў, дзе на першым месцы стаяць павага да асобы, любоў да роднай зямлі.

У той час Віленскі універсітэт быў вучэбным і адміністрацыйным цэнтрам Віленскай навучальнай акругі, якая ўключала Віцебскую, Гродзенскую, Мінскую, Магілёўскую, Валынскую, Падольскую, Кіеўскую губерніі, з'яўляючыся адукацыйна-асветніцкім і культурным цэнтрам беларускіх, літоўскіх, украінскіх зямель. Універсітэт дасягнуў еўрапейскага ўзроўню адукацыі, меў уласную навуковую школу. У канцы 20-х гадоў XIX стагоддзя студэнты мелі магчымасць вучыцца на чатырох факультэтах: маральных і палітычных навук, літаратуры і свабодных мастацтваў, фізіка-матэматычным і медыцынскім. Універсітэт з'яўляўся базай эксперыментальнага прыродазнаўства: тут дзейнічала абсерваторыя, паспяхова вяліся астранамічныя назіранні. Быў абсталяваны заалагічны музей, лабараторыі і кабінеты, закладзены батанічны сад. У бібліятэцы можна было знайсці кнігі на самых розных галінах ведаў.

Выхоўвала сама атмасфера універсітэта: дух свабоды, творчасці, магчымасць вучыцца ў лепшых айчынных і замежных выкладчыкаў. Да гонару вучоных-асветнікаў, сярод якіх Я. Снядэцкі, І. Лялевель А. Доўгірд, М. Баброўскі, І. Даніловіч, Г. Гродэк, трэба адзначыць, што яны не абмяжоўваліся вузкай спецыялізацыяй, а глыбока вывучалі гісторыю, літаратуру, аналізуючы функцыі мовы, значэнне фантазіі і ўяўлення для навукова-тэхнічнай творчасці. Выказвалася меркаванне аб тым, што паэзія, культура, выхаванне, духоўнасць вызначаюць і здольны змяніць жыццё грамадства, а гістарычны прагрэс ставіўся ў залежнасць ад духоўнага развіцця народаў і ўзроўню культуры.

Студэнты, прычым і гуманітарных, і прыродазнаўчых факультэтаў, адрозніваліся эрудыцыяй у галіне культуры, гісторыі, мастацтваў, мовы. Філаматы раілі адзін аднаму развіваць памяць і кіравацца прынцыпам: non multa – sed multum – не чытай многа, лепш грунтоўна. Вывучалі замежныя мовы: нямецкую, англійскую, французскую, каб мець магчымасць засвойваць культуру іншых народаў. У арыгінале, а не праз каментарыі, знаёміліся з творамі французскіх энцыклапедыстаў, класічнай нямецкай філасофіяй (І. Кант, Ф. Шэлінг, І. Фіхтэ), якая прываблівала іх сваім гуманістычным зместам, пошукам маральнага імператыву.

Найбольш прадстаўнічым і дзейсным з'явілася масавае легальнае студэнцкае аб'яднанне "прамяністых", якое пазней было рэарганізавана ў тайнае таварыства філарэтаў. Аб'яднанне ставіла за мэту з дапамогай забаў і жартаў, таямнічых абрадаў абудзіць высокамаральнасць, прыхільнасць да навукі, паставіць важныя грамадскія пытанні. Даючы такую назву, студэнты сыходзілі з "тэорыі промняў" – меркавання, што кожны



высокамаральны, духоўна багаты чалавек выпраменьвае дабрыню і святло. Усе сілы, якія вядуць да дабра, моладзь называла "прамяністасцю", а тыя, што штурхаюць да кепскага – распутствам. Кіраўнік аб'яднання Тамаш Зан быў перакананы, што першая прыступка да несумленнасці, подласці і здрады – гэта нежаданне людзей стрымліваць у сабе грубыя схільнасці. Ён асуджаў легкадумнасць, фізічную і маральную неразборлівасць. Гэта перакананне падзялялі і яго сябры, якія ва ўспамінах характарызуюць Т. Зана, студэнта прыродазнаўчага факультэта, як сумленнага, смелага, самаахвярнага маладога чалавека, аматара спеваў, музыкі, паэзіі, эстэтычнага і ўлюблівага. Т. Зан – аўтар "Прамовы на першай маёўцы прамяністых" [2, 216–219], дзе ў вершаванай форме растлумачыў сутнасць ідэі "прамяністасці", што з'явілася вызначальнай для ўсяго філаматцка-філарэцкага руху. Магчыма, сёння заклік да "прамяністасці" можа здацца крыху наіўным, але па сутнасці з'яўляецца мудрым і дальнабачным, паколькі ў жыцці мы міжволі цягнемся да добрых, высокародных людзей, нягледзячы на практыцызм, што актыўна прапагандуецца масавай культурай, пранікае ў сферу выхавання, грамадскіх адносін, асабістага жыцця чалавека. Гэтыя праблемы былі актуальнымі і ў мінулым. Так Ігнат Дамейка ў адным з лістоў адзначаў, што ў многіх універсітэтах студэнтаў ахапіла вольнадумнае недавер'е, матэрыяльны разлік, сухі скептыцызм. Мясцовую ж моладзь ратавала асвета, а таксама не столькі афіцыйная рэлігійнасць, колькі "прастата і набожнасць нашага люду" [2, 300].

Ствараючы такое масавае аб'яднанне, філаматы свядома ставілі перад ім выхаваўчыя задачы, а менавіта: выхаванне праз калектыў, грамадскую думку, прыклад таварышаў, якія дасягнулі большых поспехаў на шляху маральнасці. Дзеянні, учынкі, а не прыгожыя словы, прызнаваліся найбольш дзейснымі сродкамі выхавання. Разыходжанне слоў і справы строга асуджалася, лічылася амаральным. Сапраўдны грамадзянін, на думку філаматаў, павінен кіравацца не толькі пісанымі законамі, а найперш – сумленнем, мараллю, рэлігіяй, мець моцную ўнутраную спружыну, якая вызначае ўчынкі. Ідэяй "прамяністасці" захапілася шмат студэнтаў, ад чаго нават палепшылася дысцыпліна на лекцыях. Утварэнне аб'яднання мела значны грамадскі рэзананс і з'явілася прычынай руху "антыпрамяністых". "Прамяністыя" не адмаўляліся ад супрацоўніцтва са сваімі антыподамі, "фанабэрыстымі", а ставілі задачу, уцягнуўшы іх у свае справы, калі не перавыхаваць, то нейтралізаваць.

Маладыя людзі прагнулі раскаванасці, весялосці, нават бесцырымоннасці, адсутнасці сціпласці і ганарлівасці. Высмейвалі адмоўныя бакі жыцця, змагаліся з недахопамі, даводзячы іх да абсурду, бачылі ў гэтым дзейсны метад выхавання. Напрыклад, тых, хто дрэнна пiша, называлі "граматыкамі", гультаёў – "астраномамі", эгаістаў – "прафесарамі" і інш. Праводзілі пасяджэнні ў форме маёвак, пагулянак, да якіх пісалі сцэнарыі, вершы, песні, каб зацікавіць моладзь. Станоўчы

прыклад, займальнасць, метад пераканання, сарказм, іронію і сатыру члены студэнцкіх аб'яднанняў лічылі найбольш дзейснымі для выхавання. Але дапускалі, што для некаторых людзей яны малаэфектыўныя. Тады застаецца пагарда, адлучэнне ад грамадскіх спраў, што таксама разлічана на свядомасць чалавека, унутраныя рэзервы да самавыхавання. Такім чынам, метады забароны, насілля не характэрны для педагагічных поглядаў філаматаў і філарэтаў, іх этыка-педагагічную канцэпцыю можна назваць аптымістычнай, жыццясцвярджальнай. У творчасці гучаць анакрэантычныя матывы: аптымізм, услаўленне жыцця і маладосці, моцна знітаваныя з гісторыяй роднага краю, прасякнутыя верай у светлую будучыню. Крэда філаматаў дакладна выказаў Адам Міцкевіч: "Не возьмем мы хцівасць ва ўжытак – / Прэч, сквапнасці, пыхі насенне! / Наш самы высокі набытак – / Айчына, навука, сумленне!" [2, 35].

Як і ва ўсе часы, студэнцкія гады былі для маладых людзей узростам станаўлення асобы, калі павышаецца прага да самавыхавання, маральных праблем, прыгажосці знешняй і ўнутранай. А сяброўства і каханне – шляхам самапазнання, спасціжэння культуры чалавечых узаемаадносін. Каханне ў паэзіі філаматаў цесна пераплятаецца з лёсам роднага краю, кліча да высакароднай мэты. У адным сінанімічным радзе стаяць словы "каханне", "дружба", "радзіма", што падкрэслівае важнасць гэтых маральных каштоўнасцей для моладзі. Сёння вядомы імёны Марылі Верашчакі – каханай А. Міцкевіча, Зосі Малеўскай, якой прысвяціў большасць сваіх твораў Ян Чачот. Трагічнае і светлае пачуццё натхніла маладых людзей на творчасць, дасягненні ў навуцы, а жыццёвыя выпрабаванні выступілі як сродкі ўдасканалення і маральнай загартоўкі.

Здзіўляе феномен калектыўнай літаратурнай творчасці членаў таварыства. Прычыны яе: маладосць, рамантычнае ўспрыняцце жыцця, багацце індывідуальнасцей. Але галоўнае, відаць, тлумачыцца верай у сілу мастацтва, жаданнем праз далучэнне да творчасці змяніць сябе, сяброў. Філаматы ўсведамлялі, што паэзія па глыбіні ўздзеяння на пачуцці і свядомасць не мае сабе роўных сярод іншых відаў мастацтва. І яе эфектыўнасць павышаецца ў шмат разоў, калі чалавек сам спрабуе пісаць, праз асабістыя перажыванні ўздымаецца да разумення агульначалавечых ідэалаў. Творчы працэс трэніруе псіхічныя перажыванні, фарміруе ідэалаў. Творчы працэс трэніруе псіхічныя перажыванні, фарміруе перакананні і садзейнічае самаўдасканаленню. Абуджэння нацыянальнай свядомасці, пачуццяў і інтэлекту філаматы дабіваліся метадам пагружэння ў навуковую і літаратурную творчасць, свет народнай паэзіі і культуры. Эфектыўнасць такога ўздзеяння пацвярджае сучасная навука.

Увага да маральна-этычнай праблематыкі характэрна для творчасці філаматаў і філарэтаў. У пошуках ідэалу яны, безумоўна, абапіраліся на філасофію, кніжную культуру, але ў значнай ступені – на традыцыйныя народныя каштоўнасці. Філаматы і філарэты лічылі, што мараль і нацыянальны характар павінны фарміравацца праз фальклор, паэзію.



паколькі мастацтва ўздзейнічае на душу чалавека на ўсіх узроўнях адначасова, садзейнічае паляпшэнню нораваў. Яны былі перакананы, што чужая культура, няхай і вышэйшага ўзроўню, не прывядзе да сапраўдных здабыткаў маралі, не сфарміруе нацыянальныя таленты, абгрунтоўваючы сваю думку прыкладамі з гісторыі духоўнага развіцця народаў, у прыватнасці, старажытных грэкаў, якіх філаматы часта згадваюць і цытуюць у сваіх паэтычных і эпісталярных творах. Так А. Міцкевіч, у студэнцкай рабоце "Пра рамантычную паэзію" адзначае, што нават магутны Рым, дзе развіццё ўласнай народнай паэзіі было перапынена, назаўсёды застаўся толькі таленавітым пераемнікам грэчаскага мастацтва [2, 107–108]. Такім чынам, на думку студэнтаў, сляпое перайманне, занядбанне ўласнага выхаваўчага вопыту, мовы, духоўнасці, традыцый, адшліфаваных стагоддзямі граней нацыянальнага характару, штурхае да правінцыйнасці, а не да ўздыму культурнага жыцця і філасофскага пазнання свету.

Адсюль зразумела ашчаднае стаўленне філаматаў да міфалогіі, фальклору, роднай мовы, заклік да народнасці. Падобна вучоным-фалькларыстам Еўропы (Браты Грым і Е.Г. Гердэр – у Германіі, Вук Караджыч – у Сербіі) маладыя рамантыкі, узброеныя навуковым падыходам і ведамі, па-новаму адкрывалі свой народ і яго культуру. Побач з імёнамі гэтых славутых вучоных можна смела паставіць і імя філамата Яна Чачота – аднаго з першых беларускіх фалькларыстаў, руплівага збіральніка песень, паданняў, казак, прыказак, дыялектызмаў. На аснове аналізу граматычных асаблівасцей беларускай мовы Ян Чачот зрабіў арыгінальную спробу вызначыць характар народа, дбаў аб складанні слоўніка беларускай мовы і ўдасканаленні граматыкі. Аналізаваў народную творчасць з мовазнаўчых і маральна-асветніцкіх пазіцый. Так Ян Чачот заўважае, што народнай песні ўласцівы сціласць, лаканічнасць у перадачы пачуццяў, якія нярэдка вызначаюцца прыгажосцю, далікатнасцю і глыбінёй, павучальным зместам. Студэнты лічылі, што свае маральныя ідэалы, філасофскае бачанне свету народ выказаў у міфалогіі, песеннай творчасці, прычым у самых старажытных, найменш змененых яе пластах, таму ў сваіх творах звяртаюцца да часоў язычніцтва, услухваюцца ў абрадавыя песні. Увагу Адама Міцкевіча прыцягнуў адзін з самых загадкавых і старажытных абрадаў – памінанне продкаў. У прадмове да паэмы "Дзяды" А. Міцкевіч зазначае, што звычай частаваць нябожчыкаў існаваў у многіх народаў. У таямнічасці, незвычайнасці гэтага рытуалу аўтар бачыць "пэўныя маральныя павучанні і ідэі, вобразна выказаныя простым сялянскім народам" [2, 46], імкнецца праз народную паэзію спасцігнуць вечныя законы зямнога быцця.

У справе выхавання, фарміравання дасканалай асобы філаматы абапіраліся на ідэі французскага асветніка Ж.-Ж. Русо, творы якога яны грунтоўна вывучалі. Педагог выступаў за рэальныя веды, атрыманыя не з

кніг, а з жыцця, з назіранняў за прыродай, пастаноўкі вопытаў, значную ўвагу надаваў выхаванню працалюбства, навучанню рамёствам. Філаматам быў блізкі такі падыход: народныя традыцыі, вясковае жыццё і блізасць да прыроды цаніліся імі вышэй за высновы кабінетных вучоных. Не мог не імпанаваць моладзі заклік вучонага-энцыклапедыста да свабоды, роўнасці, братэрства, які грунтаваўся на веры ў прыроджаную схільнасць людзей да дабра, высокай ацэнцы іх разумовых здольнасцей.

Прычыну стрымлівання духоўнага развіцця народа філаматы бачылі ў беднасці, галечы, прыгоннай залежнасці, немагчымасці для дзяцей сялян атрымаць адукацыю, нізкім узроўні нацыянальнага самавызначэння беларусаў. Рабілі спробу ў сваіх маёнтках даць сялянам волю, адмаўляліся ад матэрыяльнага дабрабыту дзеля свабоды і роўнасці. Адной з галоўных прычын дэмаралізацыі філаматы лічылі раскошу, празмернасць у задавальненні жыццёвых патрэб, што вядзе да паслаблення традыцый, заняпаду шлюбу, існавання адных за кошт другіх. Філаматы падтрымлівалі прынцып прыроднага права, згодна якому маральныя прынцыпы і правы чалавека павінны адпавядаць агульнаму парадку прыроды, абгрунтоўвалася права кожнага чалавека на шчасце. Філаматы і філарэты, самі выхадцы пераважна з дваран, вялікія спадзяванні ўскладалі на шляхецкае саслоўе. Па розных прычынах не ўсе яны спраўдзіліся. Але для большасці з іх, нашчадкаў старажытных шляхецкіх родаў, не пустым гукам быў рыцарскі кодэкс гонару, такія рысы мужчынскага характару як смеласць, храбрасць, мужнасць. Гэта засведчылі іх годныя паводзіны ў турэмным зняволенні, а таксама далейшы лёс, які многіх прывёў пад сцягі паўстанцаў, змагароў за незалежнасць. З гэтых пазіцый асабліва каштоўнымі з'яўляюцца маральна-асветніцкія пошукі маладых дваранскіх рэвалюцыянераў, зварот да выхаваўчых традыцый не толькі сялянскіх, але і радавітых, заможных сем'яў, якія далі Беларусі шмат славутых сыноў.

Такім чынам, філаматы і філарэты з'яўляліся носьбітамі передавых для свайго часу выхаваўчых ідэй, якія спалучалі дасягненні заходнееўрапейскай педагагічнай думкі, напрацоўкі польскіх і расійскіх вучоных, а таксама ўласны вопыт, звязаны ў асноўным з традыцыямі Віленскага універсітэта, мясцовых школ, народным выхаваннем. Яны выступалі за навучанне дзяцей усіх саслоўяў, усеагульную свецкую школу, прычым "дакладна вызначаліся тры галоўныя напрамкі, на якіх канцэнтравалася распрацоўка праблем педагогікі: методыка выкладання, яго змест (падручнікі), прафесіянальная падрыхтоўка настаўнікаў" [1, 212]. Рыхтуючыся да педагагічнай дзейнасці, студэнты дэталёва вывучалі стан школьнай справы ў краі: сацыяльны склад вучняў, адпаведнасць памяшканняў, наяўнасць кніг у бібліятэках, абсталяванне кабінетаў і г.д. Галоўныя задачы школы бачылі ва ўсебаковым разумовым развіцці вучняў, уменні вызваляцца ад састарэлых поглядаў і мець уласную думку, выхаванні духоўна багатых, высокамаральных грамадзян, якія б выкарыстоўвалі набытыя веды не толькі для асабістых мэтаў, але і для грамадскіх патрэб. Па іх меркаванню, школа павінна пашыраць і прапагандаваць практычныя функцыі навук, раскрываць перад вучнямі законы "галоўнага механізму свету" [1, 213]. А для гэтага настаўнік павінен ясна ўяўляць як і чаму вучыць, валодаць высокімі маральнымі якасцямі, бо толькі праз асобу настаўніка вучні змогуць пранікнуць у сутнасць прадмета, убачыць яго сувязь з іншымі навукамі, навучыцца глыбока мысліць, удасканаліць такія рысы характару, як працавітасць, сціпласць, калектывізм. У працэсе выхавання не адмаўляліся ад рэлігіі, хаця адносіны да яе неадназначныя, паколькі рэлігія з аднаго боку была, па словах Я. Чачота, "краеугольным камнем маральнасці", а з другога – перашкаджала пашырэнню навуковых ведаў, філасофіі эпохі Асветніцтва, індывідуальнаму выбару. Значную ролю філаматы адводзілі эстэтычнаму і фізічнаму выхаванню, выкарыстанню гульняў у працэсе вучобы. Рэкамендавалі развіваць спрыт, фізічныя сілы заняткамі з палашом, коннай яздой, плаваннем і інш. На думку членаў аб'яднання, залішне мяккае і камфортнае выхаванне з'яўляецца пачаткам распешчанасці, слабаволля і іншых заган, як фізічных, так і маральных. Распрацоўваючы падручнікі для школ, філаматы на адно з першых месцаў ставілі патрыятычнае выхаванне на прыкладах герояў мінулага. Студэнты лічылі, што школа праз сістэму ўзнагарод, экзаменаў, іншых метадаў заахвочвання павінна садзейнічаць абуджэнню пазнавальных інтарэсаў вучняў, імкненню да прадаўжэння асветы, самаўдасканалення. Надавалі ўвагу прафесійнай арыентацыі моладзі, схіляючы яе займацца тымі навукамі, якія найбольш патрэбны ў краі. На думку філаматаў (у прыватнасці Яна Чачота), гэта ў меншай ступені матэматыка і прыродазнаўчыя дысцыпліны, а ў большай – права, палітычная эканомія, гісторыя, агранамія.

Перадавая студэнцкая моладзь глыбока ўспрыняла ідэю аб стварэнні дасканалага грамадскага ладу праз выхаванне і асвету. Студэнты ўзяліся за напісанне падручнікаў для школ, за падрыхтоўку энцыклапедый па розных галінах ведаў. Члены таварыства планавалі выдаваць часопіс, які б адпавядаў патрабаванням асветы грамадства. Асаблівае месца адводзілася школьнай справе: "паляпшэння спосабаў выкладання навук, выхавання любові да айчыны, абуджэння цікавасці да вучобы, выяўлення павучальных матэрыялаў і крыніц, умелага іх выкарыстання для задавальнення патрэб нашага краю" [2, 332]. Прапаноўвалася асвятляць пытанні філасофіі, вывучаць і перакладаць кнігі аб лепшых спосабах гаспадарання на зямлі. Словам, прадугледжвалася шырокая асветніцкая праграма для людзей розных заняткаў і прафесій, каб садзейнічаць матэрыяльнаму і духоўнаму дабрабыту.

Тэарэтычныя напрацоўкі неабходна было праверыць на практыцы. За гэта ўзяўся Францішак Малеўскі, які, па сведчаннях сяброў, быў адным з самых эрудзіраваных членаў таварыства філаматаў, патрабавальным да

сябе, працавітым, дасведчаным у справазнаўстве, мастацтвах і латыні. Менавіта Ф. Малеўскі стаў арганізатарам ланкастарскай школы ўзаемнага навучання для сялянскіх дзяцей у маёнтку Шчорсы, які належаў графу Адаму Храптовічу. Працягваючы справу свайго бацькі – І.Л. Храптовіча – актыўнага дзеяча Адукацыйнай камісіі, вядомага бібліяфіла, ён маральна і матэрыяльна падтрымаў ідэю студэнтаў. Школа ўзаемнага навучання ў маёнтку Шчорсы была адной з самых буйных на Беларусі, тут адначасова займаліся 250–350 дзяцей. А ўсяго, па падліках даследчыкаў, у краі дзейнічала 13 такіх школ, пры Гомельскім і Гродзенскіх вучылішчах былі арганізаваны курсы па падрыхтоўцы настаўнікаў [1, 178–180]. Прынцып работы школ узаемнага навучання дазваляў аднаму педагогу з дапамогай найбольш падрыхтаваных вучняў даць элементарныя веды вялікай колькасці дзяцей. Шырока выкарыстоўваліся табліцы і схемы. Тут сялянскія дзеці вучыліся чытаць і пісаць, працавалі ў майстэрнях, набывалі рамесніцкія навыкі. Ланкастарскія школы адкрывалі таксама ідэйныя паплечнікі філаматаў – дзекабрысты. Гэта адпавядала іх імкненню даць асвету народу. Ф. Малеўскі шырока прапагандаваў метад Ланкастара ў друку, з захапленнем дзяліўся сваімі педагагічнымі знаходкамі з сябрамі. Пазней прыйшлі да высновы аб нізкай эфектыўнасці такіх школ. Але на пэўным этапе яны мелі, безумоўна, прагрэсіўнае значэнне. Акрамя таго, прынцып узаемнага навучання быў не чужы беларускай вёсцы. Згадаем, што і будучы паэт Кастусь Міцкевіч навучаўся грамаце ад няшмат старэйшага "дарэктара".

Уражвае і можа служыць сапраўдным прыкладам для сённяшняй моладзі энергія членаў таварыства, іх прага да ведаў, шырыня і глыбіня навуковых інтарэсаў, асветніцкая праца, да якой яны актыўна рыхтаваліся са студэнцкіх гадоў. Так Адам Міцкевіч стаў найпершым паэтам Польшчы. Ян Чачот – фальклорыстам і паэтам, аўтарам першых вершаў на беларускай мове. Тамаш Зан – паэт і грамадскі дзеяч, сур'ёзна вывучаў прыроду Урала, адкрыў радовішчы меднай руды і золата. Юзаф Кавалеўскі – аўтар першай мангольскай граматыкі, мангола-руска-французскага слоўніка, іншых грунтоўных прац па манголазнаўству, доўгі час быў рэктарам Казанскага ўніверсітэта. Філарэт Аляксандр Ходзька стаў рускім консулам у Персіі пасля смерці А. Грыбаедава, дзе выдаў граматыку персідскай мовы, падручнік турэцкай мовы, вывучаў народны эпас усходніх народаў. Значны плён прынесла навукова-педагагічная праца Ігната Дамейкі, які жыў і працаваў у Паўднёвай Амерыцы. Ён неаднаразова выбіраўся рэктарам Чылійскага ўніверсітэта, пісаў падручнікі, рэарганізаваў сістэму сярэдняй і вышэйшай адукацыі гэтай краіны, зрабіў яе больш дэмакратычнай. Наш суайчыннік – аўтар 130 навуковых прац у галіне мінералогіі, фізікі, хіміі, металургіі, геаграфіі, заалогіі, батанікі, геалогіі і інш. Яго імя носяць бібліятэка ў Буэнас-Айрэсе, горны хрыбет у Андах, горад у Чылі. Ігнат Дамейка з'яўляецца нацыянальным героем Чылі, у горадзе Сант'яга яму ўстаноўлены помнік з надпісам "Грандэ Эдукадор" – Вялікі Асветнік, менавіта такога ганаровага звання ўдастоены сусветнавядомы вучоны-прыродазнаўца.



## Літаратура

1. Асвета і педагагічная думка ў Беларусі: Са старажытных часоў да 1917 г. / Пад рэд. М.А. Лазарука і інш. – Мн.: Народная асвета, 1985. – 462 с.

2. Філаматы і філарэты. Зборнік / Укладанне, пераклад польскамоўных твораў, прадмова, біяграфічныя даведкі пра аўтараў і каментарыі К. Цвіркі. – Мн.: Беларускі кнігазбор, 1998. – 399 с.